Таццяна Валодзіна (Мінск)

# Ідэнтытэт "унутраны" і "знешні" ў прасторы магічных практык беларусаў

Асноўнай дзейснай асобаю пры адбыванні магічных практык, перадусім народнамедыцынскага характару, у беларускай вёсцы выступае чалавек Веды, ідэнтыфікацыя дзейнасці якога часцей адбываецца ў рэчышчы дыхатаміі дабро – зло. Лакальная разнастайнасць найменняў такой асобы і шэраг акалічнасцяў светапогляднага плану не дазваляе сфармуляваць дыхатамію ў звыклых тэрмінах калдун – знахар. У дакладзе мяркуецца разгледзець параметры, згодна з якімі чалавек Веды сам ідэнтыфікуе сябе як “абраннік” і асоба з пэўнымі магчымасцямі ўздзеяння на навакольны свет і іншага чалавека, а таксама вызначыць тыя кірункі і прынцыпы, што складаюць ідэнтытэт знешні, у пэўнай ступені залежны ад рэпутацыі. У тэорыі В.Б. Хрыстафоравай рэпутацыя як параметр сацыяльна-камунікатыўнай прасторы вёскі суіснуе са статусам. Неад’емным складнікам сацыяльнага статусу такой асобы стае прэзентацыя сваёй улады ў розных ярусах светабудовы (верх (пчолы) – сярэдзіна (жывёлы) – ніз (змеі)), бо такім чынам сцвярджаецца звышнатуральная моц і патэнцыйныя здольнасці гэтаксама ажыццяўляць уладу ў свеце чалавечым. Даклад будуецца на палявых запісах апошніх гадоў у праекцыі на апублікаваныя звесткі XIX стагоддзя, што дэманструе змены ў гэтай сферы традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў.